## 2024 г. – 80 гадоў з часу заснавання адкрытага акцыянернага таварыства «Кобрын-тэкстыль» (1944)

ААТ «Кобрын-тэкстыль» - прадпрыемства са шматгадовай гісторыяй, асноўным напрамкам дзейнасці якога доўгі час была вытворчасць рознай тэкстыльнай прадукцыі.

Заснавана ў жніўні 1944 года як арцель «Чырвоны Сцяг». Рабочыя (каля 20 жанчын) уручную апрацоўвалі авечую воўну, на ўласных калаўротах пралі пражу, вязалі світэры, валялі валёнкі. У першыя пасляваенныя гады кожны разумеў неабходнасць хутчэйшага аднаўлення прадпрыемстваў, людзі працавалі з энтузіязмам.

У 1949 годзе ўстаноўлены ручныя ткацкія станкі, арцель пераабсталявана ў ткацкі цэх. Прадпрыемства выпускала радно, дарожкі для падлогі, хусткі. З 1950 года пачалі ткаць абрусы, з 1951 года - дываны, з 1953 года - жакардавыя пакрывалы. Працавала каля 120 чалавек. Значны ўклад у развіццё арцелі ўнеслі першы дырэктар П. Я. Алесік, старэйшы майстар З. А. Крачына, першы мастак М. Д. Іванова.

У 1957 годзе пабудаваны ткацкі цэх, у 1958 годзе з’явіліся механічныя станкі. У 1960 годзе прадпрыемства перайменавана ў фабрыку «Чырвоны сцяг». У 1963 годзе заменены апошні ручны ткацкі станок. Асноўным асартыментам сталі жакардавыя пакрывалы. У 1968 годзе ўведзены ў строй новы ткацкі цэх і складскія памяшканні, у 1969 годзе - фарбавальны цэх.

У 1979 годзе на базе ткацкай фабрыкі створана тэкстыльна-вытворчае аб’яднанне (загад № 428 ад 28.12.1978 г.). У склад ТВА ўвайшлі Антопальская ватна-прадзільная фабрыка і Дзівінскі ўчастак. З 1983 года ў сувязі з абнаўленнем абсталявання пашырыўся асартымент вырабаў, пачалі выпускаць паўтара- і двухспальныя пакрывалы, шарсцяныя камплекты, пледы, махровыя ручнікі, дэкаратыўныя тканіны.

З 1993 года - вытворча-гадлёвая аб’яднанне «Сузор’е» (загад № 148 ад 30.12.1992)., у 1995 годзе - вытворча-гадлёвая фірма «Сузор’е» (загад № 141 ад 29.12.1994 г.) У 1998-2000 гадах расшыраны асартымент дэкаратыўных і асвоены выраб тэхнічных тканін.

З 2001 года – КУВП «Кобрын-тэкстыль» (загад № 59 ад 04.04 2001 г.). З 2003 года КУВП «Кобрын-тэкстыль» перайменавана ў ААТ «Кобрын-тэкстыль» (загад № 171 ад 10.11.2003 г.). У той час прадпрыемства з'яўлялася адным з нешматлікіх у Рэспубліцы Беларусь па выпуску прадукцыі хатняга тэкстылю. Прайшло некалькі этапаў развіцця, абнаўляючы парк тэхналагічнага абсталявання і асартымент выпускаемай прадукцыі - ад вырабу мешкавіны, палавых дарожак, хустак на ручных ткацкіх станках да ўнікальных жакардавых пакрывал, ручнікоў, пледаў. Прадукцыя ААТ «Кобрын-тэкстыль» адрознівалася добрай якасцю і даступным коштам. Пастаянным заказчыкам прадукцыі з'яўляліся гандлёвыя арганізацыі, установы аховы здароўя, адукацыі, спорту і турызму, гасцініцы, прамысловыя прадпрыемствы і г. д. Прадпрыемства з'яўлялася пастаянным удзельнікам спецыялізаваных выставак і кірмашоў. За актыўны ўдзел і высокія дасягненні ў вобласці якасці ААТ «Кобрын-тэкстыль» узнагароджана мноствам дыпломаў.

Аднак прадпрыемства востра мела патрэбу ў правядзенні тэхнічнага пераўзбраення, знос актыўнай часткі асноўных фондаў склаў звыш 90%. Для ААТ «Кобрын-тэкстыль» наступілі складаныя часы, і гаварыць аб годнай будучыні далейшага існавання не даводзілася. Але ўзважаная маркетынгавая палітыка, граматны падбор персаналу, дзелавая ініцыятыва інвестара ТАА «Ібіра» (Ляхавічы) дазволілі вырашыць асноўныя праблемы, правесці пераўзбраенне вытворчасці, выйсці на рэнтабельную работу і з годнасцю вытрымліваць канкурэнцыю. У 2011 годзе прадпрыемства выйшла з глыбокага финансавага крызісу і стала працаваць больш стабільна.

Сёння ААТ «Кобрын-тэкстыль» працуе ў асноўным на давальніцкай сыравіне. Ажыццяўляецца выпуск такіх тавараў, як наматраснікі, коўдра, матрацы, пледы, падушкі, пвакрывалы, спальныя мяшкі і інш. для УП «Мэблевая фабрыка "Лагуна"» (Баранавічы). Супрацоўніцтва з буйной мэблевай фабрыкай забяспечвае наяўнасць пастаянных вялікіх заказаў на швейную прадукцыю. Шматгадовы вопыт дазваляе прадпрыемству вырабляць унікальныя вырабы. ААТ «Кобрын-тэкстыль» пад кіраўніцтвам дырэктара Алены Уладзіміраўны Ладуцька дынамічна развіваецца, і ёсць усе падставы сцвярджаць, што мае годную перспектыву.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгоры
аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Андреюк, В. В.** «Кобрин-текстиль» / В. В. Андреюк // Республика Беларусь : энциклопедия: [в 7 т.] - Минск, 2007. – Т. 4. – С. 103.

**Бондарук, Л. А.** «Кобрин-текстиль» / Л. А. Бондарук // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 483.

**Вытворча-гадлёвая фірма «Сузор’е»** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 411.

**Кобринское** текстильное производственное объединение : буклет. – Минск : Полымя, 1987.

**Юбілейныя** даты прадпрыемстваў і ўстаноў горада і раёна. Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Кобрын-тэкстыль» (1944) – 80 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 140.

**Мельнік, Р.** Аляксандр Зазуля: "У нашым жыцці трэба быць прагматыкам" / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2017. — 26 жніўня. — С. 2.

Больш за шэсць гадоў на ААТ "Кобрын-тэкстыль" гаспадарыць айчынны інвестар.

**Отчёт** о финансово-хозяйственной деятельности ОАО "Кобрин-текстиль" за 2015 год, г. Кобрин, ул. Спортивная, 2 // Кобрынскі веснік. - 2016. — 26 сакавіка. — С. 10.

**Отчет** о финансово-хозяйственной деятельности ОАО "Кобрин-текстиль" за 2014 год // Кобрынскі веснік. - 2015. — 25 сакавіка. — С. 7.

**Отчет** о финансово-хозяйственной деятельности ОАО "Кобрин-текстиль" за 2013 год // Кобрынскі веснік. - 2014. — 9 красавіка. —С. 4.

**Сідарук, І.** Творчае "сэрца" фабрыкі / Ігар Сідарук ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013.— 17 ліпеня.— С. 2.

Тэхнічны сектар на ААТ "Кобрын-Тэкстыль" называюць творчым сэрцам фабрыкі.

**Сідарук, І.** Тэкстыльшчыкі працуюць на перспектыву / Ігар Сідарук ; фота Ігара Сідарука // Кобрынскі веснік. - 2013. — 8 чэрвеня. — С. 2.

У злажаным рытме працуе сёння ААТ "Кобрын-Тэкстыль".

**Отчет** о финансовых результатах деятельности ОАО "Кобрин-текстиль" за 2011 год // Кобрынскі веснік. - 2012. - 31 сакавіка. - С. 12.

**Рекуц, С.** Пакеты в цене / Сергей Рекуц // Заря. - 2012. - 11 февраля. - С. 4.

96% акций ОАО "Кобрин-текстиль" купило ООО “Ибира”.

**Сідарук, І**. Наладка - штука тонкая... / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 8 снежня. - С. 2.

Аб памочніку майстра ткацкага цэха ААТ "Кобрын-Тэкстыль" С. Куль.

**Сідарук, І.** ... І тчэ ўпэўнена рука / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 28 лістапада. - С. 3.

Ткач з 25-гадовым стажам ААТ "Кобрын-Тэкстыль" З. Каранько.

**Волков, С.** Раз продажа, два продажа / Сергей Волков // Заря. - 2011. - 2 августа. - С. 2.

ООО "Кобрин-текстиль" выставлен на продажу.

**Гром, А.** Помнить и гордиться / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2011. - 2 ліпеня. - С. 3.

О продукции ОАО "Кобрин-текстиль".

**Жук, Е.** Текстильщики без дела не останутся / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2011. - 16-22 сентября. - С. 5.

ОАО "Кобрин-текстиль" продано ляховичским предпринимателям.

**"Кобрин-текстиль"** - лауреат конкурса "Лучшие товары РБ - 2010 г." // Кобрин-информ. - 2011. - 6 января. - С. 2.

**Отчёт** о финансовых результатах деятельности ОАО "Кобрин-текстиль" за 2010 год // Кобрынскі веснік. - 2011. - 6 красавіка. - С. 4.

**Федаровіч, І.** Дабрыня і майстэрства / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 24 снежня. - С. 3.

Аб адным з вопытных работнікаў ААТ "Кобрын-тэкстыль" В. Бартноўскай.

**Шиш, И.** У ОАО "Кобрин-текстиль" - новый собственник / Ирина Шиш, [беседовал] Игорь Федарович // Кобрынскі веснік. - 2011. - 23 лістапада. - С. 3.

**Веремеенко, С**. "Кобрин-текстиль": настоящее и будущее / Светлана Веремеенко // Кобрин-информ. - 2010. - 10 июня. - С. 2.

**"Кобрин-текстиль"** выставлено на продажу // Кобрин-информ. - 2010. - 11 ноября. - С. 2.

**Гром, А.** Сузор'е кобринского текстиля / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2010. - 20 студзеня. - С. 3.

**Гром, А.** "Кобрин-текстиль": для всех и каждого : на волне рынка / Анна Гром // Кобрынскі веснік. – 2009. – 22 жніўня. – С. 2.

**Максимчик, А.** У дизайнеров хороший вкус / Алексей Максимчик // Кобрынскі веснік. - 2008. - 3 снежня. - С. 2.

ОАО "Кобрин-текстиль".

**Васюк, Н**. Покрывало для падишаха от "Кобрин-текстиль" / Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2007. - 7 июня. - С. 2.

**Бондарук, Л. А**. Покрывало для падишаха от "Кобрин-текстиль" / [Л. А. Бондарук ; беседовала] Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2007. - 7 июня. - С. 2.

Интервью с директором ОАО "Кобрин-текстиль" Л. А. Бондарук.

**Пянко, А.** Всесторонний анализ, объективная оценка / А. Пянко Кобрынскі веснік. – 2002. – 12 чэрвеня (№ 48). – С. 1.

О работе производственного предприятия "Кобрин-текстиль".

**Навашчук, Г.** Яркія ўзоры "Сузор'я" / Г. Навашчук // Кобрынскі веснік. – 1999. – 8 верасня (№ 72). – С. 3.

Ткацкаму вытворчаму аб'яднанню "Сузор'е" – 55 год.

**ТВА – 50 гадоў** // Кобрынскі веснік. – 1994. – 20 жніўня (№ 65). – С. 3.

Тэкстыльнае вытворчае аб'яднанне адзначыла 50-годдзе.

**Пятроўская, М.** Юбілей калектыву : Кобрынскаму тэкстыльнаму вытворчаму аб'яднанню – 50 / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 1994. – 13 жніўня.

**Бялова, Н.** Галоўнае – павышэнне прадукцыйнасці / Н. Бялова // Камуністычная праца. – 1985. – 16 ліпеня.

Інтэнсіфікацыя вытворчасці Кобрынскага тэкстыльнага вытворчага аб'яднання.

**Петрукович, М.** Мастерицы / М. Петрукович // Заря. - 1985. - 9 августа.

О трудовых достижениях коллектива Кобринского текстильного производственного объединения.

**Сацэвіч, В.** Якасць – клопат агульны / В. Сацэвіч // Камуністычная праца. – 1985. – 6 ліпеня. – С. 2.

Кобрынскае тэкстыльнае вытворчае аб′яднанне.

**Пятроўская, М.** Майстэрства і прызнанне / Марыя Пятроўская // Камуністычная праца. – 1983. – 11 кастрычніка.

Кобрынскае тэкстыльнае вытворчае аб′яднанне.

**Берлін, М.** Задаюць тон у рабоце / М. Берлін // Камуністычная праца. - 1982.- 12 чэрвеня.

Передавікі вытворчасці ўносяць важкі ўклад у агульны поспех калектыву.

**Іванова, Н.** Звышпланавая прадукцыя / В. Іванова // Камуністычная праца. - 1982. - 20 лістапада.

Пакрывалы з маркай Кобрынскага ТВА ў рэкламе не маюць патрэбы.

**Міхалюк, М.** Не спыняюцца на дасягнутым / М. Міхалюк // Камуністычная праца. – 1981. – 5 сакавіка.

**Грос, В.** Асаблівым прыкладам / В. Грос // Камуністычная праца. – 1981. – 21 лютага.

Аб ветэранах Кобрынскага тэкстыльнага вытворчага аб′яднання.

**Пятручык, В.** Наш рэзерв – эканомія і беражлівасць : [Кобрынская ткацкая фабрыка] / В. Пятручык // Камуністычная праца. – 1979. – 26 ліпеня.

**Ісаева, Г.** Ёсць чым ганарыцца : [Кобрынская ткацкая фабрыка] / Г. Ісаева // Камуністычная праца. – 1979. – 1 мая.

**Няфёдаў, А.** Упэўненыя крокі наперад : [Кобрынская ткацкая фабрыка] / А. Няфёдаў // Камуністычная праца. – 1978. – 22 чэрвеня.

**Лаўранюк, З.** Нашы клопаты і праблемы : [Кобрынская ткацкая фабрыка] / З. Лаўранюк // Камуністычная праца. – 1977. – 1 студзеня.

**Акімава, В.** Шчасце ў працы / В. Акімава // Камуністычная праца. – 1976. – 10 студзеня.

Аб ткачыхе З. У. Калеснікавай.

**Акімава, В.** Брыгада высокай эфектыўнасці / В. Акімава // Камуністычная праца. – 1973. – 6 сакавіка.

Аб брыгадзе В. А. Клюкі.

**Чырун, Ф.** Дружбай моцны калектыў / Ф. Чырун // Камуністычная праца. – 1972. – 15 ліпеня.

Кобрынская ткацкая фабрыка "Чырвоны сцяг".

**Богданович, П.** Требование времени / П. Богданович // Заря. – 1971. – 27 июля.

Пути повышения производительности труда на Кобринской ткацкой фабрике "Красное знамя].

**Качан, У.** Поспехі натхняюць / У. Качан // Камуністычная праца. – 1970. – 8 снежня.

Кобрынская ткацкая фабрыка "Чырвоны сцяг".

**Каган, Б.** Организатор и воспитатель / Б. Каган // Заря. – 1969. – 21 октября.

О директоре Кобринской ткацкой фабрики В. В. Качане.

**Церабунь, А.** Па новай сістэме планавання / А. Церабунь // Камуністычная праца. – 1968. – 28 мая.

Кобрынская ткацкая фабрыка "Чырвоны сцяг" перайшла на новыя ўмовы планавання і эканамічнага стымулявання.

**Камянюк, Л.** Адна з лепшых / Любоў Камянюк // Камуністычная праца. – 1967. – 3 кастрычніка.

Аб маладой ткачыхе ткацкай фабрыкі "Чырвоны сцяг" П. Багдановіч.

Кобрынскі раён
Кобрын
«Кобрын-тэкстыль» ААТ
Фабрыкі